**BIAŁORUTENISTYKA BIAŁOSTOCKA** TOM 13, ROK 2021

# FOLKLORYSTYKA I KULTUROZNAWSTWO

***Уладзімір Аўсейчык***
*Połacki Uniwersytet Państwowy*
*Białoruś*
https://orcid.org/0000-0002-6433-0039

DOI: 10.15290/bb.2021.13.18

## Жабракі ў пахавальных і памінальных абрадах беларусаў Падзвіння (па матэрыялах XIX – пачатку XXI стагоддзя)[1]

Традыцыйная культура беларусаў у навуковых публікацыях і ў папулярных выданнях пераважна прадстаўлена як гамагенная і адзіная. У якасці яе інварыянта часцей разглядаецца сялянская культура. Такі падыход абумоўлены тым фактам, што большасць беларусаў яшчэ на мяжы XIX–XX стст. былі сялянамі. Аднак пры ўсім гэтым беларускі этнас нават на мяжы стагоддзяў быў прадстаўлены рознымі саслоўямі са спецыфічнай культурай і традыцыямі. Акрамя таго, у сацыяльнай структуры беларускага грамадства вылучаюцца і асобныя сацыяльныя групы, сярод якіх выключнае месца займаюць жабракі (старцы). Феномен жабрацтва з'яўляецца неад'емным кампанентам жыцця грамадстваў, дзе існуе сацыяльная іерархія. Гістарычныя звесткі аб жабраках у Еўропе адносяцца яшчэ да ранняга сярэднявечча[2]. На беларускіх землях гэта субкультура[3] са спецыфічным тыпам жыццязабеспячэння з'ўлялася неад'емным складнікам грамадства. Жабракі

---

1 Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па праекце БРФФД-РФФД «Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века» (Г20Р-095 ад 4 мая 2020 г.).

2 М.Л. Бутовская, М.А. Ванчатова, *Нищие как городская субкультура: устойчивость взаимоотношений нищих и общества в исторической перспективе*, «Этнографическое обозрение», 2007, № 3, с. 12.

3 Англійскі даследчык П. Бэрк (P. Burke) схільны вызначаць жабракоў як носьбітаў контркультуры, а не субкультуры, у тым сэнсе, што яны не толькі вылучаліся з навакольнага свету, але і адвяргалі яго (П. Бэрк, *Народная культура Эўропы ранняга Новага часу*, Мінск 1999. с. 73). Аднак такое разуменне жабракоў ва ўмовах беларус-

выразна адрознівалася не толькі ў пабытовым плане і паўсядзённым жыцці. Яны з'яўляліся найбольш сакралізаванай сацыяльнай групай беларускага грамадства. Для больш поўнага разумення феномена жабрацтва ў беларускай культуры важным з'яўляецца аналіз сімвалічнага статуса і рытуальных функцый гэтай групы. У гэтым плане паказальнымі будуць даследаванні ў пахавальна-памінальнай абраднасці – адной з найбольш устойлівых і кансерватыўных частак культуры.

Даследаванне прысвечана разгляду сімвалічнага статуса і рытуальных функцый жабракоў у пахавальных і памінальных абрадах беларускага насельніцтва Падзвіння[4] на аснове фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў XIX – пачатку XXI ст.

**Крыніцамі даследавання** з'яўляюцца фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы (апублікаваныя і архіўныя), зафіксаваныя на Падзвінні ў XIX – пачатку XXI ст. Сярод апублікаваных крыніц асаблівую важнасць маюць працы М.Я. Нікіфароўскага[5], А.Г. Кіркора[6], Ф. Сярэбранікава[7], Ю. Галомбэка[8], Ф. Сяліцкага[9]. Значнае месца ў працы займаюць матэрыялы ўласных палявых этнаграфічных даследаванняў аўтара, а таксама матэрыялы фальклорна-этнаграфічных экспедыцый Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія праводзіліся выкладчыкамі і студэнтамі гуманітарнага факультэта. Матэрыялы захоўваюцца ў фальклорным архіве Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Назвы жабракоў.** На Беларускім Падзвінні найбольш пашыранымі варыянтамі назваў гэтай сацыяльнай групы былі «*жабракі*» і «*старцы*». У рэгіёне існуе пэўная дыферэнцыяцыя гэтых назваў

---

кага грамадства падаецца не зусім справядлівым. У беларускім традыцыйным соцыуме старцы не былі абсалютна выключанай групай. Гэта тым больш паказальна праз разгляд іх статуса і рытуальных функцый, у тым ліку і ў абрадах пахавальна-памінальнага цыклу.

[4] Рэгіён Падзвінне (Беларускае Падзвінне) – гістарычна-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які займае паўночную частку краіны і размешчаны ў басейне Заходняй Дзвіны і яе прытокаў.

[5] Н.Я. Никифоровский, *Очерки Витебской Белоруссии. Старцы*, «Этнографическое обозрение» 1892, № 1.

[6] А. Киркор, *Этнографический взгляд на Виленскую губернию*, «Этнографический сборник» 1858, Вып. III.

[7] Ф. Серебренников, *Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах. «Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г.»*, Санкт-Петербург 1865.

[8] J. Gołąbek, *Dziady białoruskie*, «Lud», 1925, № 4.

[9] F. Sielicki, *Pieśni pogrzebowe i dziadowskie śpiewane w b. powiecie Wilejskim*, «Acta Universitatis Wratislaviensis. Slavica Wratislaviensia», 1982, № 22.

па геаграфічнаму прынцыпу. Як вынікае з палявых даследаванняў, ва ўсходняй частцы рэгіёна больш пашырана назва «старцы», у той час як на Захадзе Падзвіння – «жабракі»:

«*Хадзілі жабракі, ну каторыя дзействіцельна маліліся, там што ім давалі, хто што еў, корку хлеба. Мне так кажыцца, даўней, што*» (АГМ, КАП; в. Канстанцінава Глыбоцкага раёна)[10]; «*Ну гэта як раней называлася старцы. Гэта раньше хадзілі раньше, эта после вайны. Хадзілі па хатах, прасілі паесці, каб ужо далі кусак хлеба ці паесці чалавеку гэтаму. Хадзілі і жэншчыны, і пажылыя мужыкі, і дзеці хадзілі. Эта я добра помню*» (ТАФ; в. Шыпулі Бешанковіцкага раёна).

На Падзвінні зафіксаваны і варыянты назваў, вытворныя ад слоў «жабракі» і «старцы»: «*Старчоўкі іх у нас называлі*» (ВТА; в. Дуброва Бешанковіцкага раёна). У в. Дзедзіна Докшыцкага раёна зафіксаваны варыянт «*у жэбры хадзіць*»[11]. На Вілейшчыне, па сведчанні Ф. Сяліцкага, жабракоў называлі «*дзядамі*»[12]. У рэгіёне зафіксаваны і выпадкі, калі для абазначэння дадзенай катэгорыі наўпрост выкарыстоўваліся словы «бабка» («бабушка»), «дзед»: «*А так яны хадзілі, ну у нас тут была адна, бабка такая, яна ўсё малілася і малілася, дык ей мы насілі, як памінаць*» (ДГМ, ДНП; в. Шалагіры Докшыцкага раёна); «*Памінаець, памінаець. Цяпер у нас бацюшкі няма, а на Пасху бабушкі, якія умеюць маліцца, ведаюць малітву памінаюць*» (ВДМ, ВВУ; в. Чарніца (II) Докшыцкага раёна).

**Уключанасць жабракоў у абрады. Прычыны і характарыстыка.** Удзел старцаў у пахавальных і памінальных абрадах абумоўлены іх суаднесенасцю ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў з катэгорыяй іншасвету. Сувязь жабракоў з «тым светам» тлумачыцца праз наяўнасць такіх рысаў як старасць, беднасць, калецтвы (фізічныя адхіленні, слепата), асаблівы знешні выгляд, падарожны характар дзейнасці і выключанасць са звыклага для беларускіх сялянаў укладу жыцця, валоданне таемнымі ведамі.

***Старасць.*** У фальклорных тэкстах і этнаграфічных апісаннях жабракі пераважна згадваюцца як людзі сталага ўзросту. Гэта асаблівасць тлумачыцца аб'ектыўнай патрэбай здабываць харчаванне ў вы-

[10] Усе запісы зроблены на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

[11] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Фонд 1. Вопіс. 3. Справа. 2. Матэрыялы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ ў Докшыцкі раён (ліпень 2009 г.). Сшытак. 5. Запісы Філіпенкі У.С., Лобача У.А., Клопавай С., Высоцкай А., Жахоўскага Б., Шаўчэнка Я.

[12] Такая назва з'яўляецца даволі паказальнай. Яна указвае на ўяўленне пра жабракоў як увасабленне продкаў. У беларусаў так называлі і памерлых.

падку немагчымасці ўжо працаваць. Пра такую асаблівасць паведамляюць і рэспандэнты: «*А тыя старцы якія былі, можа калекі? – Ніякія. Старыя, ужо жывуць старыя. Старэнькія. Канешне ж маладыя не хадзілі. Старым жа пенсіі не давалі, гэта ж не цяпер*» (СМВ; в. Азёрнае Расонскага раёна). Гэта рыса ўказвае і на паходжанне самой назвы («*старцы*» ад слова «*стары*»). Не выпадковай у гэтым сэнсе ўяўляецца і адна з лакальных назваў жабракоў – «*дзяды*».

Аднак неабходна адзначыць, што такая характарыстыка як старасць не была абсалютнай для ўсіх жабракоў. Яшчэ М.Я. Нікіфароўскі адзначаў, што ў рэгіёне старцамі называлі нават дзяцей, якія прасілі міласціну[13]. На Бешанкоўшчыне, як сведчаць рэспандэнты, у катэгорыю «старцаў» таксама аб'ядноўвалі ўсіх жабракоў, незалежна ад полу і ўзросту: «*Ну гэта як раней называлася старцы. Гэта раньше хадзілі, раньше, эта после вайны. Хадзілі па хатах, прасілі паесці, каб ужо далі кусак хлеба ці паесці чалавеку гэтаму. Хадзілі і жэншчыны, і пажылыя мужыкі, і дзеці хадзілі. Эта я добра помню*» (ТАФ; в. Шыпулі Бешанковіцкага раёна).

Характарыстыцы «старасць» надавалася прынцыповае значэнне ў выбары ўдзельнікаў пахавальных і памінальных рытуалаў. Як адзначае В.А. Седакова, «старасць разумеецца як блізкасць да замагільнага свету; семантыка абрадавых функцый старых – "праваднікі ў вобласць смерці"»[14]. Адсюль большасць абрадавых дзеянняў у час пахавальна-памінальных абрадаў выконваецца менавіта людзьмі сталага ўзросту. Старыя звычайна абмываюць і апранаюць памерлага, іх запрашаюць сядзець з нябожчыкам ноччу і г.д.[15] Блізкасцю да замагільнага свету тлумачыцца і саджанне самага старэйшага жыхара вёскі на покуці, дзе ставіўся і посуд для нябожчыка (Лепельскі раён)[16]. «Пасрэдніцкая» функцыя старых выразна праяўляецца ў каляндарных памінках. Так, на Дзяды цэнтральную ролю адыгрывае старэйшы член сям'і (звычайна мужчынскага полу). Галоўная яго роля, апрача

---

[13] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 70.

[14] О.А. Седакова, *Поэтика обряда: Погребальная обрядность восточных и южных славян*, Москва 2004, с. 108–109.

[15] У.Я. Аўсейчык, *Полаўзроставыя асаблівасці ў традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння*, [в:] «Гендер и проблемы коммуникативного поведения», Новополоцк, 2010, с. 96.

[16] Т.М. Пшонка, *Асаблівасці выкарыстоўвання традыцыйнай ежы ў святах народнага календара Лепельшчыны*, [в:] «Народная культура Віцебшчыны», Віцебск 2007, с. 223.

«кіравання» ходам абраду, на сімвалічным узроўні заключалася ў непасрэднай камунікацыі з памерлымі продкамі, а менавіта іх рытуальнае запрашэнне на вячэру, адкладванне ім ежы, а ў шэрагу лакальных варыянтаў і выправаджванне дзядоў пасля заканчэння трапезы[17].

***Беднасць.*** У якасці прынцыповай характарыстыкі жабракоў выступае іх беднасць. Менавіта гэта рыса з'яўляецца адной з вызначальных: «*Старцы хадзілі, эта бедные людзі, хадзілі, хадзілі. Дают ім і дзеньгі і адзежду, ну ўсё*» (ЛАГ; в. Сініцы Бешанковіцкага раёна). Гэта характарыстыка старцаў яскрава адлюстравана і ў народных выслоўях: «З торбаю як старац», «Абарваны (абнасіўся) як той старац», «Ашарпаліся, ходзім як старцы», «Праўды як у жабрака грошай»[18]. Такая рыса з'яўляецца даволі прынцыповай. Яна мае сваёй сэнсавай асновай метафару мёртвы~бедны[19]. Акрамя таго, у народным і хрысціянскім разуменні беднасць становіцца сінонімам святасці і праведнасці. У славянскім фальклоры бедныя ўяўляюцца як Божыя людзі[20]. Аднак М.Я. Нікіфароўскі адзначаў, што не ўсе жабракі былі беднымі. Некаторыя нават прыбывалі ў памінальныя дні да храма на сваіх вазах. Але, па словах этнографа, да такіх «жабракоў» беларускія сяляне амаль не звярталіся для памінання сваіх памерлых[21].

***Калецтвы (фізічныя адхіленні, слепата).*** Пра калецтвы жабракоў (як рэальныя, так і «паказушныя») даволі часта паведамляюць крыніцы[22]. Па сведчанні М.Я. Нікіфароўскага, некаторыя жабракі наўмысна дэманстравалі свае калецтвы, каб такім чынам атрымаць больш міласціны[23]. Пра наяўнасць розных калецтваў у жабракоў сведчаць і палявыя матэрыялы. У якасці такіх калецтваў рэспандэнтамі часта называюцца адхіленні разумовага плану: «*Хадзілі і многа было да вайны жабракоў, я помню, але хадзілі. Такія каторыя трошкі ні разумныя людзі былі. Дамоў жа гэтых не было, ну пойдуць і пойдуць*» (ПГІ; в. Шо Глыбоцкага раёна). У якасці парушэнняў называецца і слепата. Рэспандэнтамі згадваецца і традыцыя вадзіць сляпых старцаў,

---

[17] У.Я. Аўсейчык, *Полаўзроставыя...*, с. 96.

[18] *Выслоўі*, Мінск 1979, с. 279, с. 282, с. 368.

[19] О.А. Седакова, *Поэтика...*, с. 110.

[20] К. Михайлова, *О семантике странствующего певца-нищего в славянской народной культуре*, [в:] «Язык культуры: семантика и грамматика», Москва 2004, с. 140.

[21] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 86.

[22] Тамсама, с. 85; F. Sielicki, *Pieśni...*, s. 100.

[23] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 85.

а таксама наяўнасць павадыра: «*Масей яго звалі, дык ён сьляпы быў, і яго ўсё па дзярэўні вадзілі. Была такая баба-старуха, яна вадзіла яго. Ну дык ён пад акно падойдзець і моліцца*» (ІАГ; в. Петрашы Сенненскага раёна). Ва ўмовах традыцыйнага (міфапаэтычнага) грамадства калецтвы (фізічныя адхіленні, слепата) збліжаюць старцаў з іншасветам. Асабліва прынцыповай і важнай выглядае наяўнасць такой прыкметы як слепата. Гэта рыса, па меркаванні К. Міхайлавай, надае ім асаблівую сакральнасць. У наіўнай карціне свету слепата захоўвае міфалагічнае значэнне прадстаўніка чужога свету, «таго свету», смерці. А самі сляпыя ўраўноўваюцца з мёртвымі. Згодна з міфалагічным мысленнем, слепата – гэта знак прароцтва, ведаў і мудрасці, божы дар, які дазваляе бачыць патаемнае. А таму сляпыя разумеюцца як медыятары, якія могуць кантактаваць з тагасветам, са светам памерлых[24].

***Асаблівы знешні выгляд.*** Пры характарыстыцы жабракоў разам з калецтвамі і фізічнымі адхіленнямі істотнае значэнне маюць асаблівасці іх знешняга выгляду і наяўнасць спецыфічных атрыбутаў. Нярэдка ў крыніцах старцы апісваюцца з прынцыповымі знешнімі рысамі – нямытае, парванае, старое, з заплатамі адзенне, наяўнасць барады, торбы, пугі і інш. Нязвыклымі выглядаюць і не характэрныя для пары года элементы адзення (напрыклад, наяўнасць аблавухі нават у летні перыяд)[25]. Такая характарыстыка знешняга выгляду жабракоў даецца і сучаснымі вяскоўцамі: «*Старцы былі, хадзілі старцы. Абыкнавенныя, ну адзетыя ў лахманах, у яго сумка чараз плячо*» (ХНГ; в. Лабачова Бешанковіцкага раёна). Атрыбуты старцаў ва ўмовах міфапаэтычнага мыслення набываюць знакавую нагрузку. Так, у беларускім фальклоры пуга нярэдка выступае як атрыбут святых ці прадстаўнікоў іншасвету (лесавіка, лазавіка, чорта)[26]. Доўгая барада таксама з’яўляецца прыкметай сакральнасці. Яна з’яўляецца неад’емным атрыбутам Бога, святых, духаў. У славян барада нават становіцца абавязковым атрыбутам іканапісных вобразаў святых[27].

«***Падарожныя людзі***». У этнаграфічных крыніцах XIX – пачатку XX ст. і сучасных палявых матэрыялах старцы ўстойліва характарызуюцца як людзі падарожныя, тыя, хто прыходзяць у вёску або

[24] К. Михайлова, *О семантике...*, с. 143–144.
[25] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 75.
[26] *Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік*, Мінск 2011, с. 379.
[27] К. Михайлова, *О семантике...*, с. 150; *Міфалогія беларусаў...*, с. 40.

з'яўляюцца на могілках ці каля храма ў адпаведныя дні. Разам з беднасцю «падарожнасць» з'яўляецца найбольш прынцыповай характарыстыкай жабракоў: «Цягаецца (валочыцца) як жабрак які»[28]. У народных уяўленнях старцы – гэта тыя, хто ходзяць і просяць. Адсутнасць у жабракоў дому, сям'і і гаспадаркі, пастаяннае прабыванне ў дарозе рабілі іх у вачах беларускіх сялянаў людзьмі адрознымі, выключанымі са свайго соцыуму. Разам з тым, у беларускім традыцыйным светапоглядзе дарога ўвасабляе сувязь з іншасветам, са светам памерлых[29]. Таму жабракі, як людзі падарожныя, выступаюць у народнай свядомасці медыятарамі паміж гэтым і «тым светам», светам жывых і памерлых. А падкрэслена высокі статус жабракоў прадвызначыў нават іх параўнанне з Богам. Даследчык М.Я. Нікіфароўскі таксама адзначаў, што сяляне шанавалі старцаў як божых пасланнікаў, бачылі ў іх ці святога ці самога Бога[30]. З матэрыялаў народнай прозы беларусаў вынікае, што сюжэт, у якім Бог (або святыя) ходзіць у вобразе жабрака, даволі папулярны[31]. Паданні з такім сюжэтам яшчэ фіксуюцца сярод беларускага сельскага насельніцтва Падзвіння: «*Як тая бабулька кажыць, ужо зямелька грэшная, а даўна Бог хадзіў па свеце, выпрабоўваў людзей, ён хадзіў у відзе жабрака. Бабуля наша расказывала, ён у відзе жабрака быў*» (ММУ; в. Таргуны Докшыцкага раёна). Аналогія з падарожным Богам нават увасобілася ў адной з назваў жабракоў у беларусаў – «падарожны (божы) чалавек»[32]. Сярод сучасных беларускіх вяскоўцаў сталага ўзросту яшчэ захоўваецца ўяўленне аб старцах як божых пасланніках: «*Эта Бог жабракоў прысылаець*» (Віцебскі раён); «*Як хадзіў старац, мама казала. Прыдзіць старац, дык эта сама дарагі госць. Ядуць усе за сталом і старца прыглашаюць. Ён чэсны, ён ад Бога*» (МРУ; в. Рамашкава Талочынскага раёна).

***Выключанасць старцаў са звыклага ўкладу жыцця.*** Нягледзячы на пашыраныя кантакты са старцамі, апошнія не з'яўляліся для беларускіх вяскоўцаў часткай «свайго» соцыуму. Гэта, у першую чаргу, абумоўлена колькасцю і характарам такіх кантактаў. Як

---

28 *Выслоўі...*, с. 416.

29 *Міфалогія беларусаў...*, с. 140.

30 Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 88.

31 *Легенды і паданні*, Мінск 1983, с. 43, с. 54, с. 55–56, с. 75, с. 115, с. 390; У.А. Лобач, *Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння, Ч. 1*, Наваполацк 2011, с. 47, с. 54.

32 *Міфалогія беларусаў...*, с. 459.

паведамляў М.Я. Нікіфароўскі, да старцаў падыходзілі на самы кароткі час, каб падаць міласціну, з імі размаўлялі толькі пра тое, за чыю «душаньку» творыцца падаянне і інш. У сваю чаргу, па словах этнографа, старцы пазбягалі царквы і споведзі[33]. Знаходжанне жабракоў звязвалася з тымі кропкамі прасторы, якія на сімвалічным узроўні асацыююцца з мяжой з іншым светам. Так, старцы спыняліся і спявалі пад «чырвоным вакном», з боку двара, зімой у хаце, у баку ад дзвярэй, без шапкі[34]. На медыятыўны статус указвае і характар частавання старцаў – не за сталом, а на лаве каля парога[35]. У якасці месцаў начлегу старцаў у крыніцах згадваюцца лазня, авін і г.д. (г.зн. месцы маргінальныя, месцы кантакту з іншасветам)[36]. Прытым паказальна, што сведчанні таго, што жабракі начавалі ў лазнях, фіксуюцца яшчэ і ў сучасны перыяд: «*Ну яна* [жабрачка] *тады ўжо прыдзіць ну, кажа, памяні можа прыпомні там Таня ці Манька, яна ўжо памоліцца гэта баба. І а дык кажыць, прыйшла раней на нач, дык у бані начавала, хоць у чыю ж, баню топяць, ну дык яна назбіраіць хатуль ці торбы гэтыя*» (ВАІ; в. Шалашы Докшыцкага раёна). Набліжанасць да іншасвету ва ўяўленнях вясковага насельніцтва нарадзіла ўяўленне аб тым, што на «*месцы старцавай стаянкі і трава не расце*»[37]. Час, калі адбываліся кантакты са старцамі, таксама быў пераважна «памежным». Жабракі з'яўляліся ў вёску пераважна ў памінальныя дні (Радаўніца, Тройца, Дзяды). Найбольш часта старцаў можна было ўбачыць каля храмаў у вялікія гадавыя святы. У міфапаэтычнай карціне свету беларусаў свята разумеецца як сітуацыя часавага (і нават часава-прасторавага, па вызначэнні У.А. Лобача[38]) «памежжа». А таму ў час святаў у свеце людзей назіраецца прысутнасць прадстаўнікоў «таго свету» (напрыклад, з'яўленне памерлых продкаў на Дзяды і інш.). З'яўленне ж старцаў у вёсцы (на могілках, каля храма) у такія дні актуалізавала ўяўленне аб іх як прадстаўніках іншасвету (па меншай меры, рабіла іх у вачах вяскоўцаў медыятарамі паміж гэтым і «тым светам»).

---

[33] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 70, с. 85.

[34] Тамсама, с. 85.

[35] Тамсама, с. 73.

[36] Тамсама, с. 84.

[37] Тамсама, с. 81.

[38] У.А. Лобач, *Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пач. XX ст.)*, Аўтарэферат. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.07, Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Мінск 2003.

***Валоданне таемнымі ведамі.*** Як і ўсім «не сваім» (у этнічным, прафесійным, сацыяльным, канфесійным плане) жабракам прыпісвалі валоданне таемнымі ведамі (у т.л. знахарскімі і чараўніцкімі). Такія ўяўленні падмацоўваліся і з прычыны наяўнасці ў старцаў своеасаблівай таемнай мовы. Як сведчаць крыніцы, наяўнасць "сваёй" мовы ў жабракоў была даволі пашыранай з'явай ва ўсходнеславянскіх народаў[39]. Такую рысу адзначаў і беларускі этнограф Е.Р. Раманаў[40].

У этнаграфічных апісаннях старцам часта прыпісваецца валоданне пэўнай здольнасцю, рамяством ці прафесіяй. Як сведчаць крыніцы, у тым ліку і выяўленчыя, жабракі нярэдка былі музыкамі. Пра валоданне такімі здольнасцямі жабракамі яшчэ памятаюць рэспандэнты: «*А вось старцы ці хадзілі? – Ой, хадзілі. Ужо гэта і я помню. – А яны проста жабравалі, ці маліліся неяк? – Ну вот такі быў, як яго фамілія, можа Краснабаеў. Дык тот, як прыхадзіў, дык на нейкая, я яшчэ саўсем небальшэнька была, добра помню на дудзе іграў*» (ШВІ, ГНП, СРІ; в. Янкавічы Расонскага раёна). Падобная характарыстыка старцаў яшчэ больш рабіла іх «іншымі» ў вачах беларускага селяніна, а таму нараджала ўяўленне аб валоданні імі іншымі ведамі, у т.л. і магічнымі.

У народнай прозе беларусаў Падзвіння жабракі часта фігуруюць як моцныя знахары. Прытым іх здольнасці апісваюцца даволі разнастайна (замаўляюць ад розных хвароб, ад змей, выкрыццё чараўнікоў і інш.). Магічныя якасці прыпісваліся нават рэчам, якімі валодалі жабракі (торба, ежа, грошы і інш.). А таму іх атрыбуты нярэдка выкарыстоўвалі ў магічных аперацыях і лекаванні[41].

Такім чынам, ва ўяўленнях беларускай традыцыйнай супольнасці жабракі разглядаліся як знаўцы розных таемных ведаў. Таму, па меркаванні вяскоўцаў, гэтыя веды могуць быць выкарыстаны ў пахавальнай абраднасці (а таксама ў сферах, блізка з ёй звязаных). У гэтым плане паказальны сюжэт, дзе жабрачка дапамагае памерці:

[39] Е.Е. Левкиевская, *Нищий*, [в:] «Славянские древности: этнолингвистический словарь», Москва 2004, с. 408.

[40] Е.Р. Романов, *Белорусский сборник. Вып. 9: Опыт словаря условных языков Белоруссии*, Вильно 1912, с. 6–7.

[41] У. Васілевіч, *Зямля стаіць пасярод свету...: беларускія народныя прыкметы і павер'і*, Мінск 1996, с. 394; У. Васілевіч, *Жыцця адвечны лад: беларускія народныя прыкметы і павер'і*, Мінск 1998, с. 110; Т.В. Валодзіна, *Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка*, Мінск 2007, с. 521; Н.Я. Никифоровский, *Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии*, Витебск 1897, с. 155.

*Даўней было што, доўга паміралі. Я была сама пры гэтым дзеле. У нас была адна старая дзевушка, яна крэпка начытаная, яна спявала красіва і сабірала яна субота васкрэсенне* (...) *Патом саседка прыходзіць і яе просіці «Авілька, прыдзі ты да нас, памаліціся вы ў нас!» У яе свёкр умíраў, гэта даўно-даўным.* (...) *Гэта ўжо мы на трэцці дзень былі, і мы нічога ў яго ня вымалілі. А вот, пака не прыйшла жабрачка.* (...) *Маленне не памагала. На заўтра прыходзіць жабрачка. А што не рабілі, паталок вырывалі. Ну што казалі можа, а ён жа так казаў дзядзька быў врэдны, ну нічым ніхто не прызнаваў, каб ён які врэд каму наносіў. Прыходзіць жабрачка, і будзіць казаць: «Ёсць у вас, – гэта было пры саветах, – хамут арымы?» «А чаму ж няма?!» І вот кажыць: «Вазьміце на яго як ён, так падзяржыце, налажыце». Ён і сканаў* (АГМ, КАП; в. Канстанцінава Глыбоцкага раёна).

**Старцы ў пахавальнай абраднасці і індывідуальных памінках.** Крыніцы пастаянна згадваюць аб вялікай колькасці жабракоў на пахаванні памерлага, дзе іх кармілі, частавалі і надзялялі міласцінай[42]. Наяўнасць старцаў – характэрная рыса кожнага пахавання на Падзвінні ў мінулым. Па сведчанні П.М. Шпілеўскага, старцы не прысутнічалі толькі на пахаванні самагубцаў[43]. Удзел старцаў у пахавальным абрадзе адбываецца праз выкананне імі двух тыпаў аперацый. Першы ўключае рытуальныя дзеянні, якія выконвалі выключна жабракі. Да другога адносяцца абрадавыя аперацыі, якія не так строга рэгламентаваны і могуць выконвацца іншымі ўдзельнікамі.

Першую групу складаюць большай часткай дзеянні, што звязаныя з адорваннем старцаў, якія прысутнічаюць на пахаванні, або адмысловая перадача пэўных рэчаў, падача міласціны ўжо пасля пахавання. Так, у некаторых лакальных варыянтах пахавальнага абраду адзенне памерлага, яго рэчы, а таксама ручнікі і мыла, якімі мылі памерлага, аддавалі жабракам. Пра такую традыцыю яшчэ памятаюць рэспандэнты: «*Чым мылі нябожчыка? – Я прастым мылам мыла, а тады мыла тое і палаценца. Вот як былі такія жабракі аддавалі гэта. Цяпер жа няма жабракоў*» (КГІ; в. Валодзькі Докшыцкага раёна). Хлеб і соль, якія суправаджалі нябожчыка на могілкі, таксама адда-

[42] П.В. Шейн, *Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края*, т. 1, ч. 2: *Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях*, Санкт-Петербург 1890, с. 514, с. 521, с. 526.

[43] *Пахаванні. Памінкі. Галашэнні*, Мінск 1986, с. 104.

валі жабракам[44]. Ім аддавалі і тыя манеты, якімі прыкрывалі вочы памерлага[45].

Міласціна жабраку разглядаецца як адна з форм перадачы неабходных рэчаў для памерлага на «той свет». Таму лічылася, што як сняцца памерлыя і скардзяцца на недахоп якіх рэчаў, то іх трэба перадаць жабракам. Паколькі старцы разглядаліся як пасрэднікі паміж гэтым і «тым светам», а нярэдка і як тыя, хто прыйшоў з «таго свету», то міласціна ім сімвалізавала долю, якая выдзяляецца памерлым. Па сведчанні этнографа А.Я. Багдановіча беларускія сяляне верылі, што лепшым спосабам перадаць што памерламу – даць гэта старцам. І гэта пяройдзе нябожчыку на тым свеце[46]. Сярод беларускага насельніцтва было распаўсюджана таксама меркаванне, што душы памерлых харчуюцца той ежай і апранаюцца ў тое адзенне, якія пры жыцці былі перададзены жабраку і якія раздаюць за нябожчыкаў жывыя родзічы[47]. Таму лічылася, што міласціна, пададзеная жабраку, можа аблегчыць пасмяротнае жыццё чалавека на «тым свеце». І наадварот, крыўда або падман у адносінах да старцаў пагражае пераадрасацыяй памерлым продкам[48].

Да другога тыпу адносяцца самыя разнастайныя аперацыі і рытуальныя дзеянні, якія выконваліся ў час пахавальнага абраду. Зафіксаваны выпадкі, калі магілу запрашалі капаць старых або жабракоў бясплатна[49]. Па сведчанні П.М. Шпілеўскага, за труной у час руху пахавальнай працэсіі на могілкі ішлі жабракі, якія неслі куццю, канун, гарэлку і розную ежу – усё гэта з'ядалі пасля пахавання на магіле[50]. Нягледзячы на тое, што ў іншых лакальных варыянтах гэтыя аперацыі маглі выконваць і другія ўдзельнікі абраду, выкананне іх старцамі не выглядае выпадковым. Шлях на могілкі, які ва ўмовах міфапаэтычнай свядомасці асэнсоўваецца як дарога на «той свет», можа быць пераадолены толькі адпаведнымі агентамі-пасрэднікамі. Гэтымі пасрэднікамі і ўяўляліся старцы, якія маюць магчымасць «перадаць» гэтыя стравы памерлым продкам. «Багадзельныя бабы» (г.зн. тыя жабрачкі, якія

[44] П.В. Шейн, *Материалы...*, с. 514.

[45] *Пахаванні...*, с. 102.

[46] А.Е. Богданович, *Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк*, Гродно 1895, с. 53–54.

[47] Тамсама, с. 54–55.

[48] У.А. Лобач, *Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве*, Мінск 2013, с. 343–344.

[49] *Пахаванні...*, с. 101.

[50] Тамсама, с. 103.

жылі ў багадзельнях) з'яўляліся пры адпяванні і пахаванні памерлага. Некаторых з іх запрашалі «абражаць» памерлага ці сядзець ноч каля яго[51].

Крыніцы сведчаць аб традыцыі запрашаць жабракоў на памінальнае застолле ў дзень пахавання. Застолле для жабракоў было апошнім (першы стол быў для знатных людзей, другі – для сярэдняй рукі). У час гэтага памінальнага застолля жабракі ўшаноўвалі памерлага, спявалі песні і чыталі духоўныя вершы[52].

У крыніцах зафіксавана і традыцыя адорваць жабракоў у памінальных абрадах на працягу года з дня смерці. Сярод беларусаў Себежскага павета існаваў памінальны абрад, які адбываўся ў першую нядзелю пасля пахавання. У гэты дзень родныя памерлага адпраўляліся ў царкву. Туды яны прыносілі ў глінянай ці драўлянай місе куццю, накрытую двума ці трыма невялікімі хлябамі. Падчас літургіі куцця ставілася каля абраза, а ў верхні хлеб устаўлялася свечка, якая гарэла падчас літургіі і паніхіды. У гэты дзень у царкве адбывалася памінанне памерлых. Пасля службы хлябы аддаваліся прычту, а куццю падносілі родным і знаёмым; рэшткі яе аддавалі жабракам, якія былі ў гэты час у храме[53]. Крыніцы сведчаць пра традыцыю раздаваць жабракам міласціну на памінках у 40-вы дзень з дня смерці і на гадавіну[54].

**Старцы ў каляндарных памінальных абрадах.** У структуры каляндарных памінак (Дзяды, Радаўніца, Вялікдзень, Тройца) жабракі таксама займалі важнае месца. Іх роля ў каляндарных памінальных абрадах была вельмі істотнай нават у параўнанні са святаром. А таму, як сведчаць крыніцы, памінанне ў царкве часта дапаўнялася і памінаннем з дапамогай старцаў. Таму не дзіўна, што рэспандэнты паведамляюць аб частай наяўнасці жабракоў у дні каляндарных памінак каля храма: «*А вот на магілкі ці прыхадзілі на Радуніцу жабракі? – А як жа? І каля цэрквы былі, і каля касцёла былі. Цяпер во даюць усім грошы, а даўней былі. Поўна было жабракоў, сядзелі. Як тольќа празнік, так яны і сідзяць*» (КАУ; в. Верацеі Пастаўскага раёна). Ва ўяўленнях беларускай традыцыйнай супольнасці царкоўнае богаслужэнне ў важныя гадавыя памінальныя дні з'яўляецца надзвычай агульным. А та-

---

[51] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 97.

[52] П.В. Шейн, *Материалы...*, с. 521.

[53] Ф. Серебренников, *Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах. «Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г.»*, Санкт-Петербург 1865, с. 89–90.

[54] П.В. Шейн, *Материалы...*, с. 527.

му на долю канкрэтнага памерлага з агульнай малітвы прыходзіцца надзвычай мала[55]. Менавіта таму, як сведчаць крыніцы, незалежна ад царкоўнага памінання, сяляне ўшаноўвалі памерлых праз старцаў. Калі ж старац ведаў «спевы», то ён памінаў памерлых паіменна, па чарзе. У адваротным выпадку праз міласціну прасілі памянуць *«усіх нашых дзядоў»*[56].

У этнаграфічных крыніцах адзначаецца таксама прысутнасць старцаў на могілках у памінальныя дні: *«А на кладбішча яны* [старцы] *прыхадзілі? – Прыхадзілі і на кладбішчэ. Асобенна в помінальные. Там тожэ давалі ім. Раньшэ было. Сейчас ужэ нету»* (ЛКМ; в. Верацеі Пастаўскага раёна). У памінальныя дні жабракі наведвалі не толькі храм і могілкі, але і хаты вяскоўцаў. Як вынікае з крыніц, характар і месца памінання у розныя каляндарныя святы залежаў пераважна ад характару самога свята (на могілках, у храме ці дома). Так, калі памінанне памерлых на Дзяды адбывалася дома, то і старцы хадзілі па вёсках (у дзень свята, або на наступны), а калі памінанне на Радаўніцу, Тройцу, Вялікдзень праходзіла на могілках і ў храме, то і жабракі з'яўляліся туды.

Неад'емным элементам каляндарнай памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння з'яўляецца адорванне старцаў ежай ці грашыма. Так, у Пастаўскім раёне на Радаўніцу неслі *«на ўбогія»* – г.зн. ежу для жабракоў, каб тыя памянулі памерлых[57]. У шэрагу выпадкаў ежу для жабракоў пакідалі на магілах пасля памінання, каб тыя памянулі памерлага[58]. У Барысаўскім павеце на Радаўніцу частавалі старцаў чырвонымі яйкамі, якія каталі да гэтага па магіле[59]. Этнограф М. Анімеле паведамляў, што каталіцкае насельніцтва рэгіёна ў Дзень Задушны наведвала багадзельні для бедных каля касцёла і прыносіла туды розную ежу[60]. У шэрагу месцаў зафіксавана традыцыя на Дзяды (або назаўтра) адорваць жабракоў стравамі з памінальнага стала[61]. Пра такі характар адорвання старцаў згадваюць і рэспандэнты: *Даўней*

[55] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 87.

[56] П.В. Шейн, *Материалы...*, с. 620.

[57] Т.Г. Гарошка, *Народныя святы, абрады, звычаі*, [у:] *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна*, Мінск 2001, с. 597.

[58] J. Gołąbek, *Dziady białoruskie*, «Lud», 1925, № 4, s. 18; *Пахаванні...*, с. 107.

[59] П.В. Шейн, *Материалы...*, с. 622.

[60] *Пахаванні...*, с. 161.

[61] А. Киркор, *Этнографический взгляд на Виленскую губернию*, «Этнографический сборник», 1858, Вып. III, с. 154.

*хадзілі бедныя жабракі, як пенсію не палучалі, дак дарылі ім, кусок хлеба, кусок сала давалі. З гэтага стала. ... А яны молюцца, памянуць за гэтых памёршых усіх* (ВГФ; в. Несцераўшчына Докшыцкага раёна). Жабракам іншы раз аддавалі ежу і з т.зв. «дзедаўскай талеркі» (адкладзеная ў час рытуальнай трапезы ў асобную талерку ежа для памерлых продкаў)[62].

Да каляндарных памінак у рэгіёне пашырана традыцыя пячы для жабракоў (з мэтай памянуць памерлых) адмысловы невялікі хлябец (*«курац»*, *«курчык»*): *Даўней жа ж як Дзяды, дык мама спецыяльна пякла такую булку вам скажу. Вот такі вот курчык, вот такі вот доўганькі. Гэта заўтра ж прыдзіць ужо ж па курцах, прыдзіць баба знаті.* (...) *На каждыя Дзяды. Дык і пяклі* (ВАІ; в. Шалашы Докшыцкага раёна). На Вілейшчыне існавала традыцыя даваць старцам столькі хлябцоў, колькі памінался памерлых[63].

**Аказіянальныя памінанні.** Як вынікае з крыніц, спосаб памінання памерлых праз жабракоў не абмяжоўваўся толькі днямі каляндарных памінак. Распаўсюджанымі былі і памінанні ў адвольны час, калі жабракі прыходзілі ў вёску. Разам з агульнымі малітвамі аб ураджаі і здароўі сям'і, старцы таксама памінальі памерлых продкаў[64].

Магчымасць памінання памерлых мелася і пры наведванні храма. У мінулым, як паведамляюць рэспандэнты, жабракі пастаянна знаходзіліся каля храма. А таму магчымасць памянуць памерлага не абмяжоўвалася толькі спецыяльнымі днямі: *Гэтыя людзі сядзелі пад касцёлам. Яны сядзелі і маліліся. Ну вот ідзеш і яму рубялёк, два дасі. А тока імя і фамілію скажаш памёршага свайго. А ён сядзіць і моліцца* (БМП; в. Слабада Лепельскага раёна). Памінанне памерлых жабракамі, якія знаходзіліся каля храма, магло адбывацца і ў важныя каляндарныя святы, да якіх іншых памінальных рытуалаў не было прымеркавана:

*Паміналі. Дык во гэтая самая з Дзедзіна, дык сама ужо знала нас, дык помню на Каляды, цяпер памінаюць, а раней было, вот гэта і мама казала і свякроў, што нада на Каляды як первы дзень у цэркаві, дык там многа сядзіць этых нішчых, і нада тады ўзяць па кусочку сала па невялікаму каб усім даць. Хоць па невялікім, алі каб абдзяліць усіх, сколькі іх там ёсць. І памінаць* (ММУ; в. Таргуны Докшыцкага раёна).

---

[62] П.В. Шейн, *Материалы...*, с. 597.

[63] F. Sielicki, *Pieśni...*, s. 98.

[64] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 79–81.

Даследчык С.П. Сахараў адзначаў, што сярод беларусаў Латгаліі існавала традыцыя памінаць памерлых на Іллю. У гэта свята старцы збіраліся каля храма і паміналі памерлых. За гэта іх адорвалі хлебам, яйкамі і грашыма[65].

Аказіянальны варыянт памінання памерлых мог ажыццяўляцца не толькі ў хаце ці каля храма. Пра яшчэ адзін варыянт паведамляў М.Я. Нікіфароўскі. Этнограф апісваў памінальны рытуал т.зв. «багадзельнымі бабамі» (г.зн. тыя, хто жылі ў багадзельнях). У такім выпадку само памінанне адбывалася ў багадзельні. Туды заходзілі і падавалі міласціну, каб памянуць родных. Даследчык М.Я. Нікіфароўскі наступным чынам апісваў такое памінанне. Стол накрываўся абрусам, у бажніцы запальвалася свечка. «Бабы» размяшчаліся каля стала і спявалі «Лазара», а ў канцы «*чыталі памін па сроснічках*». Пасля паміну іх адорвалі прынесеным[66].

**Сучасны стан.** Як вынікае з крыніц, сімвалічны статус і рытуальныя функцыі старцаў у беларускай вясковай супольнасці ў многіх аспектах захоўваліся яшчэ да сярэдзіны XX ст. Як сведчаць матэрыялы палявых даследаванняў, памінанне з дапамогай старцаў у міжваенны перыяд і сярэдзіне XX ст. было нават больш папулярнае, чым царкоўнае ўшанаванне памерлых. Ва ўмовах савецкага грамадства афіцыйнае царкоўнае памінанне не заўсёды было магчымым (з-за зачыненых храмаў і адсутнасці святароў). У такіх выпадках памінанне памерлых з дапамогай старцаў было яшчэ больш пашыраным: «*Хадзілі* [старцы]*, патаму што перад вайной ужо цэрквы не стала. А тады ўжо хадзілі вот старушкі. Маліліся, вот і цяпер молюцца, цяпер молюцца*» (БВМ; в. Чарнічка (II) Докшыцкага раёна).

Сучасныя ж вяскоўцы паўсюдна адзначаюць знікненне дадзенай сацыяльнай групы. У сувязі з гэтым знікае і магчымасць памінання памерлых праз іх: *Былі* [жабракі], *але цяпер ужо ня ходзяць, ня молюцца, грошэй даюць усім, цяпер няма старых. Малися, тожа хадзілі. Ты ей ужо кладзеш, ей наложаш адзельна, такія* (ДМІ, ДЯТ; в. Замасточча Докшыцкага раёна). У шэрагу выпадкаў рэспандэнтамі адзначаецца знікненне такой традыцыі ў сувязі са смерцю старых жабракоў: *А вот калі яны* [жабракі] *перасталі хадзіць зусім? После вайны, нядаўна ж ішчо на магільніку паміналі. Паўміралі, няма каму* (ЧГЛ; в. Дзедзіна Докшыцкага раёна). Нягледзячы на існаванне і ў сучасны перыяд

[65] *Latviešu folkloras krātuve.* 1561. Sergeja Saharova Latvijas baltkrievu folkloras vākums, № 1346.

[66] Н.Я. Никифоровский, *Очерки...*, с. 89, с. 92, с. 93.

катэгорыі людзей, што просяць міласціну, рэспандэнты адзначаюць прынцыповую розніцу паміж “цяперашнімі” жабракамі і “ранейшымі”: *А вот да вайны ці хадзілі такія старцы? Жабракі такія? – Яны, нішчыя, хадзілі і тады і ціпер. Ну дык ціпер саўсім другія. Ну дык тада дзействіцельна старцы хадзілі, пеша* (ГВІ, ГВА; в. Пабеда Шумілінскага раёна).

Як вынікае з матэрыялаў палявых даследаванняў, у сучасны перыяд з-за адсутнасці старцаў перавага аддаецца царкоўнаму памінанню. У такой сітуацыі у памінальных абрадах жабракоў замяняе святар.

*Цяпер прыходзіць бацюшка на Радаўніцу і на Асяніны, моліцца. Але жабракоў ужо і німа*» (КАУ; в. Верацеі Пастаўскага раёна); «*Нікаторыя ж умелі ў нас у Чарніцах маей мамы цётка о-ой, яна як быцюшка пела, малілася Хрыстос Васкрэс. Эта яна очень, очэнь* (...) *яе так бралі, пад ручкі вадзілі кажды да сваей магілы. Ну а цяпер жа бацюшка цяпер. Ня ходзюць старушкі* (ШВМ, ШГЯ; в. Чарнічка (I) Докшыцкага раёна).

**Вывады.** Такім чынам, аналіз фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў XIX – пачатку XXI стагоддзя дазваляе зрабіць наступныя высновы. Жабракі ўяўляюць своеасаблівую сацыяльную групу, спецыфіка якой выразна праяўляецца ў рытуальных формах паводзін у абрадах пахавальна-памінальнага цыклу. Іх удзел у пахавальных і памінальных абрадах абумоўлены суаднесенасцю ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў з катэгорыяй іншасвету. Сувязь жабракоў з «тым светам» тлумачыцца праз наяўнасць такіх рысаў як старасць, беднасць, калецтвы (фізічныя адхіленні, слепата), асаблівы знешні выгляд, падарожны характар дзейнасці і выключанасць са звыклага для беларускіх сялянаў укладу жыцця, валоданне таемнымі ведамі. Удзел старцаў у пахавальным абрадзе адбываецца праз выкананне імі двух тыпаў аперацый: рытуальныя дзеянні, якія маглі выконваць і іншыя ўдзельнікі (капанне магілы, абмыванне і апрананне памерлага, удзел у пахавальнай працэсіі), і аперацыі, якія выконваюць выключна жабракі (звязаныя пераважна з адорваннем старцаў міласцінай, ушанаваннем памерлых старцамі ў час памінальнай трапезы). У структуры каляндарных памінак (Дзяды, Радаўніца, Вялікдзень, Тройца) старцы адыгрывалі істотнае значэнне. Іх роля была вельмі важнай нават у параўнанні са святаром. Жабракі былі ўключаны ў памінальныя рытуалы на могілках, у хаце і каля храма. Спосаб памінання памерлых праз жабракоў не абмяжоўваўся толькі днямі каляндарных памінак. Распаўсюджанымі былі памінанні ў адвольны час (каля храма, у важныя гадавыя святы, у хаце, калі старцы з’яўляліся ў вёсцы).

Сацыяльны статус і рытуальныя функцыі старцаў у беларускай вясковай супольнасці ў многіх аспектах захоўваліся да сярэдзіны XX стагоддзя, а ўяўленні рэспандэнтаў сталага ўзросту і ў наш час маюць даволі архаічны характар. Аднак з-за знікнення старцаў перапыняецца і традыцыя памінання памерлых з іх дапамогай.

## LITERATURA


Auseichyk U. Ya., *Polauzrostavyia asablivastsi u tradytsyinai pakhaval'na-paminal'nai abradnastsi belarusau Padzvinnia*, «Gender i problemy kommunikativnogo povedeniia», Novopolotsk 2010 [Аўсейчык У.Я., *Полаўзроставыя асаблівасці ў традыцыйнай пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння*, «Гендер и проблемы коммуникативного поведения», Новополоцк: ПГУ 2010].

Berk P., *Narodnaia kul'tura Europy ranniaga Novaga chasu*, Minsk 1999 [Бэрк П., *Народная культура Эўропы ранняга Новага часу*, Мінск 1999].

Bogdanovich A.E., *Perezhitki drevnego mirosozertsaniia u belorusov. Etnograficheskii ocherk*, Grodno 1895 [Богданович А.Е., *Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк*, Гродно 1895].

Butovskaia M.L., Vanchatova M.A., *Nishchie kak gorodskaia subkul'tura: ustoichivost' vzaimootnoshenii nishchikh i obshchestva v istoricheskoi perspektive*, «Etnograficheskoe obozrenie», 2007, № 3 [Бутовская М.Л., Ванчатова М.А., *Нищие как городская субкультура: устойчивость взаимоотношений нищих и общества в исторической перспективе*, «Этнографическое обозрение», 2007, № 3].

Fiadosik A.S., *Pakhavanni. Paminki. Galashenni*, Minsk 1986 [Фядосік А.С., *Пахаванні. Памінкі. Галашэнні*, Мінск 1986].

Garoshka T.G., *Narodnyia sviaty, abrady, zvychai*, «Pamiats': gistoryka-dakumental'naia khronika Pastauskaga raena», Minsk 2001 [Гарошка Т.Г., *Народныя святы, абрады, звычаі*, «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пастаўскага раёна», Мінск 2001].

Gołąbek J., *Dziady białoruskie*, Lud, 1925, № 4, 1–40.

Kirkor A., *Etnograficheskii vzgliad na Vilenskuiu guberniiu*, «Etnograficheskii sbornik», 1858, V. III [Киркор А., *Этнографический взгляд на Виленскую губернию*, «Этнографический сборник», 1858, Вып. III].

*Legendy i padanni*, Minsk 1983 [*Легенды і паданні*, Мінск 1983].

Levkievskaia E.E., *Nishchii*, «Slavianskie drevnosti: etnolingvinisticheskii slovar'», Moskva 2004 [Левкиевская Е.Е., *Нищий*, «Славянские древности: этнолингвинистический словарь», Москва 2004].

Lobach U.A., *Mif. Prastora. Chalavek: tradytsyiny kul'turny landshaft belarusau u semiiatychnai perspektyve*, Minsk 2013 [Лобач У.А., *Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыв*, Мінск 2013].

Lobach U.A., *Polatski etnagrafichny zbornik. Vyp. 2: Narodnaia proza belarusau Padzvinnia.* Pt. 1, Navapolatsk 2011 [Лобач У.А., *Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння*, ч. 1, Наваполацк 2011].

Lobach U.A., *Uiaulenni ab prastory i chase u tradytsyinym svetapogliadze belarusau (pa etnagrafichnykh i fal'klornykh materyialakh XIX – pach. XX st.).* (Autareferat. dys. ... kand. gist. navuk: 07.00.07). Nats. akad. navuk Belarusi. In-t mastatstvaznaustva, etnagrafii i fal'kloru, Minsk 2003 [Лобач У.А., *Уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў (па этнаграфічных і фальклорных матэрыялах XIX – пач. XX ст.).* (Аўтарэферат. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.07). Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Мінск 2003].

Mikhailova K., *O semantike stranstvuiushchego pevtsa-nishchego v slavianskoi narodnoi kul'ture*, «Iazyk kul'tury: semantika i grammatika», Moskva 2004 [Михайлова К., *О семантике странствующего певца-нищего в славянской народной культуре*, «Язык культуры: семантика и грамматика», Москва 2004].

*Mifalogiia belarusau: entsyklapedychny slounik*, Minsk 2011 [*Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік*, Мінск 2011].

Nikiforovskii N.Ia., *Ocherki Vitebskoi Belorussii. Startsy*, «Etnograficheskoe obozrenie», 1892, № 1 [Никифоровский Н.Я., *Очерки Витебской Белоруссии. Старцы*, «Этнографическое обозрение», 1892, № 1].

Nikiforovskii N.Ia., *Prostonarodnye primety i pover'ia, suevernye obriady i obychai... Vitebskoi Belorussii*, Vitebsk 1897 [Никифоровский Н.Я., *Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии*, Витебск 1897].

Pshonka T.M., *Asablivastsi vykarystouvannia tradytsyinai ezhy й sviatakh narodnaga kalendara Lepel'shchyny*, «Narodnaia kul'tura Vitsebshchyny», Vitsebsk 2007 [Пшонка Т.М., *Асаблівасці выкарыстоўвання традыцыйнай ежы ў святах народнага календара Лепельшчыны*, «Народная культура Віцебшчыны», Віцебск 2007].

Romanov E.R., *Belorusskii sbornik. Vol. 9: Opyt slovaria uslovnykh iazykov Belorussii*, Vil'no 1912 [Романов Е.Р., *Белорусский сборник. Вып. 9: Опыт словаря условных языков Белоруссии*, Вильно 1912].

Sedakova O.A., *Poetika obriada: Pogrebal'naia obriadnost' vostochnykh i iuzhnykh slavian*, Moskva 2004 [Седакова О.А., *Поэтика обряда: Погребальная обрядность восточных и южных славян*, Москва 2004].

Serebrennikov F., *Obychai i obriady krest'ian Sebezhskogo uezda pri krestinakh, svad'be i pokhoronakh*, «Pamiatnaia knizhka Vitebskoi gubernii na 1865 g.», Sankt-Peterburg 1865 [Серебренников Ф., *Обычаи и обряды крестьян Себежского уезда при крестинах, свадьбе и похоронах*, «Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г.», Санкт-Петербург 1865].

Shein P.V., *Materialy dlia izucheniia byta i iazyka russkogo naseleniia Severo-Zapadnogo kraia. Vol. 1. Pt. 2: Bytovaia i semeinaia zhizn' belorusov v obriadakh i pesniakh*, Sankt-Peterburg 1890 [Шейн П.В., *Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1. Ч. 2: Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях*, Санкт-Петербург 1890].

Sielicki F., *Pieśni pogrzebowe i dziadowskie śpiewane w b. powiecie Wilejskim*, „Acta Universitatis Wratislaviensis. Slavica Wratislaviensia” 1982, № 22.

Valodzina T.V., *Narodnaia medytsyna: rytual'na-magichnaia praktyka*, Minsk 2007 [Валодзіна Т.В., *Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка*, Мінск 2007].

Vasilevich U., *Zhytstsia advechny lad: belaruskiia narodnyia prykmety i paver'i*, Minsk 1998 [Васілевіч У., *Жыцця адвечны лад: беларускія народныя прыкметы і павер'і*, Мінск 1998].

Vasilevich U., *Ziamlia staits' pasiarod svetu...: belaruskiia narodnyia prykmety i paver'i*, Minsk 1996 [Васілевіч У., *Зямля стаіць пасярод свету...: беларускія народныя прыкметы і павер'і*, Мінск 1996].

*Vysloui*, Minsk 1979 [*Выслоўі*, Мінск 1979].

## SUMMARY

### BEGGARS IN FUNERAL AND MEMORIAL RITES OF BELARUSIAN DVINA REGION (BASED ON THE 19TH – EARLY 21ST CENTURY MATERIAL)

On the basis of folklore and ethnographic material of the 19th – early 21st century the symbolic status and ritual functions of beggars in funeral and memorial rites of Belarusian Dvina region are discussed. The beggars represent a peculiar social group, the specificity of which is most expressively manifested in the ritual forms of behavior, including the funeral and memorial rites of the dead. The reasons of their inclusion into the ritual sphere (through the analysis of such characteristics as poverty, physical deviations, blindness, special appearance, possession of secret knowledge, the nature of their “activity”, isolated lifestyle) are presented. The article deals with the status and ritual functions of beggars in the funeral rites and rites of the memorial cycle (within a year from the date of death and calendar holidays). New field material is involved in the study, part of which is fixed by the author. The results of the research will be useful in the study of worldviews and beliefs.

**Key words**: beggars, Belarusians, Dvina region (Podvine), traditional culture, funeral rite, memorial rite.